на нем присутствовал эмоциональный подъем, дух состязательности и элемент неожиданности, которые будут способствовать активизации воображения студентов во время выполнения необходимых, часто однообразных упражнений. Обучение на основе игровой деятельности и диалогического взаимодействия предполагает изменения в обстановке, в которой проводятся занятия, в учебных материалах, в средствах обучения, в структуре взаимоотношений «преподаватель – студент».

Результатом диалогической педагогической технологии становится не только усвоение иностранного языка, готовность обучающихся участвовать во всех формах реального общения, но и развитие способности к различным идентификациям и, как следствие, формирование мотивации на понимание другого, на диалог, способствующий взаимообмену и взаимообогащению культурными ценностями. У студентов формируется способность к партнерскому сотрудничеству и потребность в нем, стремление к наиболее продуктивным и эффективным взаимоотношениям в группе, что в значительной мере снижает уровень тревожности, замкнутости, враждебности – факторов, негативно влияющих на психическое здоровье как индивида, так и общества в целом.

***М.В. Стралец, д-р гіст. навук, прафесар***
*БДТУ (Брест)*

## УЦЯГНЕННЕ ЮРЫДЫЧНЫХ І ФІЗІЧНЫХ АСОБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ У СТРУКТУРЫ НАРОДНАЙ ДЫПЛАМАТЫІ У КАНТЭКСЦЕ УНУТРЫБЕЛАРУСКІХ РЭАЛІЙ

Усебаковая падтрымка народнай дыпламатыі з'яўляецца неад'емным элементам дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Яна зыходзіць з таго, што ў гэтай дыпламатыі не павінна быць перашкодаў ні ў прававым, ні ў палітычным, ні ў арганізацыйна-тэхнічным сэнсах. Гэта вельмі выразна прапісана ў гістарычных рашэннях III-га Усебеларускага Народнага Сходу, які адбыўся 2-3 сакавіка 2006 г. ў Менску.

Яскравы прыклад цывілізаванага стаўлення да замежнай грамадскасці пастаянна дэманструе Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Г. Лукашэнка, які мае змястоўны вопыт непасрэдных зносін з няўрадавымі дэлегацыямі многіх краін. Уладныя структуры нашай краіны ўспрымаюць народную дыпламатыю скрозь прызму канстытуцыйна замацаванага міралюбнага знешнепалітычнага курса Рэспублікі Беларусь і яе гуманістычнай у сваім грунце вонкавай і ўнутранай палітыкі, агульначалавечага вымярэння знешнепалітычных працэсаў, стварэння спрыяльных вонкавых умоў для пераходу Беларусі ад індустрыяльнай цывілізацыі да постіндустрыяльнай, адкрытасці дадзенай дзяржавы для ўсяго свету, магчымасцяў азнаямлення сусветнай грамадскасці з беларускай сацыяльна-эканамічнай мадэллю, пераадолення стэрэатыпаў ва ўспрыманні ўнутрыбеларускіх рэалій за мяжой, фармавання трывалай тканіны добрасуседства ў міжнародных адносінах.

Уцягненнасць юрыдычных і фізічных асоб Рэспублікі Беларусь у ажыццяўленне народнай дыпламатыі можна характарызаваць па наступным параметрам: геаграфічнаму, галіне міжнародных сувязяў, суб'ектам кантактаў, спосабу арганізацыйна-тэхнічнага забеспячэння, удзельнай вазе ў агульным аб'ёме кантактаў.

*Геаграфічны параметр.* Дадзены параметр вызначаецца перш за ўсё прыярытэтамі вонкавай палітыкі рэспублікі, наяўнасцю інтарэса грамадзян нашай краіны да канкрэтных дзяржаў, існаваннем памежных у дачыненні да Беларусі краін. Да дасягнення Рэспублікай Беларусь дзяржаўнай незалежнасці ў 1991 г. айчынная народная дыпламатыя мела вельмі абмежаваную геаграфію. З 1991 г. яна пакрысе набыла глабальны маштаб.

*Галіна міжнародных сувязей.* Пры разглядзе дадзенага параметра трэба перш за ўсе выключыць тую сферу, якая рэгулюецца дыпламатычным правам. У выніку застаецца невычарпальная для ахопу ў навучальным працэсе сфера, якая ўключае:

- сувязі паміж суб'ектамі палітычных працэсаў, якія не маюць афіцыйных паўнамоцтваў ад дзяржаўных органаў улады;
- супрацоўніцтва, у якім у якасці бакоў выступаюць арганізацыі, рухі, у якіх аб'яднаны суб'екты гаспадарання, працадацелі, працаатрымальнікі;
- сумесныя міжнародныя акцыі ў рамках пацыфісцкага, экалагічнага рухаў;
- кантакты паміж творчымі саюзамі;
- замежныя выступленні дзеячаў культуры (гастролі, кінапаказы, выставы, фестывалі, прэзентацыі, прэс-канферэнцыі і г. д.);
- гуманітарнае супрацоўніцтва;
- міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы і г. д.

*Суб'екты кантактаў.* У працэсе ажыццяўлення народнай дыпламатыі магчымы наступныя варыянты кантактаў:

- унутрыбеларускія суб'екты народнай дыпламатыі ↔ дзяржаўныя структуры замежных краін;
- замежныя суб'екты народнай дыпламатыі ↔ органы дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь;
- унутрыбеларускія суб'екты народнай дыпламатыі ↔ замежныя суб'екты народнай дыпламатыі.

*Спосаб арганізацыйна-тэхнічнага забеспячэння.* Унутрыбеларускія суб'екты народнай дыпламатыі можна градзіраваць па наступных прызнаках:

а) наяўнасць статуса юрыдычнай асобы;
б) пастаянны ці часовы рэжым функцыянавання;
в) прыналежнасць да канкрэтных міжнародных няўрадавых арганізацый;
г) рэальная роля ва ўнутраным жыцці краіны;
д) наяўнасць фундатараў.

*Удзельная вага ў агульным аб'ёме кантактаў.* Самы дынамічны з усіх параметраў, найбольш складаны з пункту гледжання рэальных статыстычных падлікаў.

Ключавой структурай народнай дыпламатыі у Беларусі з'яўляецца Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі.



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by